# Ахоўнік Альманскіх балот

**Педагогі з глыбінкі — асаблівыя людзі. Яны жывуць жыццём сваей вескі, свайго краю, сваіх навучэнцаў.**

**І адзін з такіх педагогаў — Васіль Сівак, настаўнік біялогіі і хіміі Дзяржынскай сярэдняй школы Лельчыцкага раёна. Кожны дзень с самага маленства і да сённяшняга дня ён прысвячае ахове прыроды роднага краю і вучыць гэтаму сваіх навучэнцаў.**

Вёска Дзяржынск знаходзіцца каля самай беларуска-ўкраінскай мяжы, у акружэнні амаяь не кранутай, не парушанай кояамі і чаяавекам прыроды. Не-падаяёк — Альманскія бапоты з іх рэспубяіканскім ландшафтным заказнікам плошчай 942 кв.км. Гэта адзін з найбуйнейшыху Еўропе комплексаў балот. І гэтую прыроду Васіль з маленства з захапленнем даследаваў: з сябрамі прападаў у лесе, назіраючы за жыццём яго насельнікаў — ад кузурак да жывёл, шмат хадзіў у грыбы, ягады з дзядулем І бабуляй. Любіў бываць тут і адзін.

— Я назіраў за мурашнікамі, за птушынымі гнёздамі, глядзеў, колькі яек у якім гняздзе якая птушка адлажыла, як птушаняты аперваюцца, вырастаюць і інш. Тады ж, яшчэ школьнікам, вырашыў, што стану настаўнікам біялогіі, бо, хоць мне І падабапася прафесія ляснічага, усё ж хацелася не толькі самому ведаць прыроду, але і іншых навучыць, — гаворыць Васіль Уладзіміравіч.

Вывучаць біялогію толькі па падручніках было б недарэчнасцю, таму галоўныя веды пра прыроду хлопчыкі і дзяўчынкі атрымліваюць у мясцовым лесе ці на прышкольным участку, ведаючы, не на якой старонцы якая птушка намалявана, а ў якім урочышчы якая з іх жыве. Унікальная мясцовая прырода стала домам для многіх чырванакніжнікаў — і раслін, і жывёл, і птушак. Іх вывучэннем і зацікавіліся школьнікі.

Напрыклад, яны вывучалі жыццё і звычкі чорных буслоў — сімвала Лельчыцкага краю, сонь — рэдкіх звяркоў, падобных на вавёрку і мыш адначасова (каб здымаць фота І відэа, дзеці рабілі для іх спецыяльныя домікі з камерай унутры). Вялікую работу Васіль Уладзіміравіч з навучэнцамі правёў па выяўленні векавых дубоў — патэнцыяльных прэтэндэнтаў на статус батанічных помнікаў прыроды. Захавалі дзяржынскія школьнікі водны арэх, які таксама занесены ў Чырвоную кнігу: несение з некалькіх заўважаных тут раслін яны рассадзілі ў рацэ. Абгароджаныя ад касцоў і перададзеныя пад ахову райінспекцыі палянкі з венерыным чаравічкам на ўскрайку лесу — таксама іх рук справа. Гэтыя і іншыя дзіцячыя даследаванні ўжо больш як 10 гадоў запар аказваюцца ў ліку лепшых на абласных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях “Пошук”, “Моладзь і экалагічныя праблемы сучаснасці”, на лясным юніёрскім конкурсе “Квітней, мой лес”.

— Для мяне галоўнае — не проста вучыць дзяцей, а даваць ім права на свае адкрыцці, каб дзеці пачутае на ўроку прапусцілі праз сябе, зрабілі важныя высновы, якія спатрэбяцца ім у жыцці. Таму падштурхоўваю дзяцей, каб яны ад тэорыі пераходзілі да практыкі, — гаворыць настаўнік.

Адысці ад тэорыі школьнікам давялося і з-за неабдуманага будаўніцтва акурат праз заказнік дарог. Таму апошнія гады гордасць за свой унікальны родны куток у дзяржынскіх школьнікаў змянілася на трывогу, у сваіх даследаваннях яны цяпер вывучаюць не біяразнастайнасць, а тое, наколькі ўразлівая яна перад чалавекам. Як толькі заракатапі ў заказніку экскаватары, Васіль Уладзіміравіч быў сярод актыўных праціўнікаў будаўніцтва. Асабліва настаўнік хваляваўся за чырванакніжнікаў, для якіх балота дагэтуль было домам:

— Менавіта тут, на Альманах, гняздуецца найбуйнейшая ў свеце папуляцыя вялікага арляцу. Ён надзвычай чуллівы да турбавання чалавекам. Баіцца шуму І яшчэ больш рэдкая птушка — сіваваронка, якая таксама заўважана тут.

Спужаў бы шум I чорных буслоў. Загінулі б і балотныя чарапахі, якіх па нашых падліках тут ад 80 да 120 асобін. Тэты генатып больш нідзе ў Еўропе ўжо не сустракаецца. Чарапахі гняздуюцца ў пясчаных ледавіковых дзюнах, якія пачалі разбіраць на падсыпку дарогі. Таму мы паведамілі ў райінспекцыю, дзе знаходзяцца гнёзды, каб там будаўнікі пясок не чапалі.

Дзеці навукова даказалі негатыўны антрапагенны ўплыў на распаўсюджанасць журавін, без якіх цяжка ўявіць Альманы. Не абышлі ўвагай і мясцовую ўнікальнасць — ягадыальбіносы з велізарным утрыманнем калію. Тут, на Альманах, дзеці разам з настаўнікам знайшлі некалькі мясцін з белымі чарніцамі, брусніцамі і буякамі. Гэтым феноменам ужо зацікавіўся Інстытут лесу НАН Беларусі і ўжо рассадзіў белыя буякі на сваіх плантацыях. У супрацоўніцтве з арганізацыяй "Ахова птушак Бацькаўшчыны" школьнікі разам са сваім настаўнікам даследуюць "сваю" частку Альманскіх балот. Яны пачалі праводзіць улік птушак, шукаць гнёзды, аналізаваць фотаздымкі з устаноўленых у гнёздах камер, фіксаваць чырванакніжнікаў, выяўляць рэдкія расліны і наносіць усё тэта на карты.

Ужо сёння дзяржынская школа стала месцам, якое аб'ядноўвае людзей з усёй Беларусі, неабыякавых да лёсу заказніка. "Ахоўнікі Альманскіх балот" — менавіта так называецца група зацікаўленых людзей, якую па ініцыятыве АПБ стварыў і ўзначапіў В.У.Сівак. Пакуль дарожнае будаўніцтва ў заказніку прыпынілася, але небяспека працягу існуе. У перспектыве ахоўнікі мараць зрабіць Альманскія балоты запаведнікам, бо статус заказніка (хоць і рэспубліканскага значэння) не забараняе весці тут гаспадарчую дзейнасць. Цяпер абмяркоўваецца ўключэнне ўсяго Прыпяцкага Палесся, куды ўваходзяць і Альманскія балоты, у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэта, спадзяецца Васіль Уладзіміравіч, дапаможа рэалізаваць яшчэ адну яго ідэю — стварыць экалагічную сцежку, дзе можна было б людзям з гордасцю паказваць захаваныя славутасці Лельчыцкага краю — векавыя борці і знаёміць з мясцовымі бортнікамі і іх справай, хвапіцца старажытнымі дубамі, чорнымі буслامі і белымі ягадамі.

Святлана НІКІФАРАВА

**Источник:** Настаўніцкая газета. – 2019. – № 125. – С. 1.